УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ А. Я. МАКАЁНКА, ДРАМАТУРГА, НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА БССР

**12 ЛІСТАПАДА 1920 Г. – 16 ЛІСТАПАДА 1982 Г.**

**ФОНД № 438**

**ВОПІС № 1**

**1948–1990 гг.**

**МІНСК 2023**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1          ф. 438**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. МАКАЁНКА | 1-3 | 1 |
| 2 | ДАКУМЕНТЫ ПРА А.Я. МАКАЁНКА. ПІСЬМО ДА А.Я. МАКАЁНКА | 4-10 | 1-2 |
| 3 | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 11-14 | 2-3 |

## Прадмова

**Макаёнак Андрэй Ягоравіч** (псеўданімы А. Жур, А. Журавіцкі, А. Малаказдатчык) нарадзіўся 12 лістапада 1920 г. у вёсцы Борхаў Рагачоўскага павета Гомельскай губерні ў сялянскай сям'і. Бацькі – Ягор Сяргеевіч і Маланння Міхайлаўна Макаёнкі. У 1938 г. скончыў сярэднюю школу сяла Журавічы (райцэнтр у Гомельскай вобласці). У 1939 г. прызваны ў Чырвоную армію, праходзіў службу на Каўказе. У жніўні – верасні 1941 г. удзельнічаў у Іранскай аперацыі савецкіх і англійскіх войскаў. У снежні 1941 г. – красавіку 1942 г. ваяваў у Крыме (удзельнік Керчанска-Феадасійскай дэсантнай аперацыі). У красавіку 1942 г. цяжка паранены, праз чатыры месяцы дэмабілізаваны. Працаваў ваенруком у школе вёскі Акаурты (Грузія). Пасля вызвалення Гомельскай вобласці ад нямецкіх акупантаў (канец 1943 г.) вярнуўся на радзіму. У 1944–1947 гг. – на камсамольскай і партыйнай рабоце (уступіў ва УКП(б) у 1945 г.), у 1947–1949 гг. навучаўся ў Рэспубліканскай партшколе пры ЦК КП(б)Б. У 1949–1953 гг. – загадчык аддзела прозы часопіса "Вожык", у 1956–1957 гг. – літкансультант Саюза пісьменнікаў БССР, у 1966–1977 гг. – галоўны рэдактар літаратурнага часопіса "Неман". Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР у 1971–1982 гг. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага сцяга, "Знак пашаны", медалямі "За адвагу" і "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.".

Пісаць вершы і невялікія празаічныя творы пачаў у школьныя гады. Дэбютаваў у друку ў 1946 г. п'есай-аднаактоўкай "Добра, калі добра канчаецца". Да пачатку 1950-х гг. напісаў яшчэ некалькі аднаактовых п'ес: "Перад сустрэчай", "Жыццё патрабуе", "Першае пытанне" і інш. У 1949 г. прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР. Першыя шматактовыя п'есы А.Я. Макаёнка – "Ворагі", "Узыходы шчасця", "Выйгрыш" (1947–1948) – пры жыцці аўтара не друкаваліся і не ставіліся. У 1951 г. была надрукавана ("Полымя", № 6) і ў 1952 г. пастаўлена на сцэне (Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы) яго шматактовая драма "На досвітку". Наступныя п'есы А.Я. Макаёнка – "Выбачайце, калі ласка" (1953), "Каб людзі не журыліся" (1957) і "Лявоніха на арбіце" (1960) – прысвечаны праблемам беларускай вёскі і напісаны ў жанры сатырычнай камедыі. Сцэнічны лёс п'ес склаўся па-рознаму: камедыя "Каб людзі не журыліся" хутка пасля пастаноўкі была знята кіраўнічымі структурамі з тэатральнага рэпертуару, а п'есы "Выбачайце, калі ласка" і "Лявоніха на арбіце" атрымалі ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне. У канцы 1960-х – 1970-я гг. творчасць А.Я. Макаёнка-драматурга ўзбагацілася новымі тэмамі, жанравымі формамі і сродкамі сцэнічнай выразнасці. Друкуюцца і ставяцца на сцэне яго трагікамедыі "Зацюканы апостал", "Трыбунал", "Кашмар" ("Святая прастата"), "Пагарэльцы", камедыя-рэпартаж "Таблетку пад язык", сентыментальная камедыя "Верачка". Апошнім закончаным творам А.Я. Макаёнка стала трагікамедыя-прытча "Дыхайце эканомна!", надрукаваная і пастаўленая ўжо пасля яго смерці. Вядомы перш за ўсё як драматург, А.Я. Макаёнак выступаў і ў якасці фельетаніста, аўтара

гумарэсак і сатырычных апавяданняў (ранні перыяд творчасці), перакладчыка і кінасцэнарыста. Па сцэнарыях А.Я. Макаёнка пастаўлены фільмы “У адзінай сям’і” (1957), “Шчасце трэба берагчы” (1958), “Кандрат Крапіва” (1961), “Рагаты бастыён” (1964), “Пасля кірмашу” (1973).

А.Я. Макаёнак – лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы (1962), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1974), Народны пісьменік БССР (1977).

А.Я. Макаёнак памёр у Мінску 16 лістапада 1982 г. Пахаваны на Усходніх могілках Мінска[1].

Дакументы А.Я. Макаёнка паступілі ў БДАМЛМ у 2002 г. з розных крыніц. Машынапісныя экземпляры п’ес “Перад сустрэчай” і “Дышите экономно!” былі перададзены Міністэрствам культуры Беларусі, фотаматэрыялы – рэдакцыямі газеты “Літаратура і мастацтва” і часопіса “Маладосць”. Водзывы А.Я. Макаёнка на творы маладых літаратараў, напісаныя па даручэнні работнікаў ЦК КПБ, і выразкі з газет і часопісаў 1980–1990 гг. з публікацыямі пра А.Я. Макаёнка былі сабраныя супрацоўнікамі БДАМЛМ. У выніку навуковага апісання сабраных матэрыялаў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 14 спраў (78 дакументаў) за 1948–1990 гг. Вопіс складаецца з трох раздзелаў, ва ўсіх раздзелах дакументы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе.

Раздзел першы “Творчыя дакументы А.Я. Макаёнка” (справы 1–3) змяшчае машынапісныя экземпляры п’ес А.Я. Макаёнка і рукапісы яго водзываў на работы маладых літаратараў.

Раздзел другі “Дакументы пра А.Я. Макаёнка. Пісьмо да А.Я. Макаёнка” складаецца з 7 спраў (з 4-й па 10-ю). У справах 4–8 аб’яднаны газетныя і часопісныя публікацыі пра А.Я. Макаёнка, у большасці прымеркаваныя да пэўных дат і падзей. Справа 4 змяшчае водгукі прэсы на 60-гадовы юбілей драматурга (1980), справа 5 – некралогі А.Я. Макаёнка (1982), справа 6 – публікацыі да 70-годдзя з дня яго нараджэння (1990). Успаміны пра А.Я. Макаёнка аб’яднаны ў справу 7, газетныя публікацыі пра яго, не прымеркаваныя да пэўнай даты, – у справу 8. У справе 9 – праграма мерапрыемства з удзелам А.Я. Макаёнка і друкаванае запрашэнне на вечар яго памяці; у справу 10 вылучана пісьмо да А.Я. Макаёнка (як рэдактара часопіса “Неман”) перакладчыка Д.М. Кавалёва (адзіны эпісталярны дакумент у фондзе).

Раздзел трэці “Выяўленчыя дакументы” змяшчае насценны фотапартрэт А.Я. Макаёнка (справа 11), яго індывідуальныя фатаграфіі (справы 12–13) і яго сумесныя фота з дзеячамі літаратуры, тэатра і інш. (справа 14).

Прадмову склаў
вядучы архівіст — А.У. Адліванчык
29.09.2023

[1] Біяграфічныя звесткі пра А.Я. Макаёнка складзены на аснове артыкулаў С.С. Лаўшука “Макаёнак Андрэй Ягоравіч” у біябібліяграфічным слоўніку “Беларускія пісьменнікі” (Т. 4. Мн., 1994. С. 167–169) і ў энцыклапедыі “Тэатральная Беларусь” (Т. 2. Мн., 2003. С. 65–66).

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛМ

_____________

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1 ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. МАКАЁНКА** | | | | |
| 1 | А.Я. Макаёнак. "Перад сустрэчай". Камедыя-аднаактоўка. Машынапіс | 1948 | 21 | 1 | |
| 2 | А.Е. Макаёнок. "Дышите экономно". Трагікамедыя. Машынапіс з [аўтарскай] праўкай | 1982 | 64 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 3 | А.Е. Макаёнок. "Об очерках т. Тропина о Гродненском подполье". Водзыў. А.Я. Макаёнак. [Водзыў на аповесць У. Малашкевіча "Братья"]. Аўтографы | [1966-1967] | 5 | 2 | |
| | **2 ДАКУМЕНТЫ ПРА А.Я. МАКАЁНКА. ПІСЬМО ДА А.Я. МАКАЁНКА** | | | | |
| 4 | Да 60-годдзя А.Я. Макаёнка: Т. Арлова "Працую сатырыкам..."; В. Быкаў "Маладая няўрымслівасць таленту"; П. Васілеўскі "Размова на адлегласці" і інш. Артыкулы, заметкі, замалёўкі, нарыс, інтэрв'ю, журналісцкая справаздача. З фотапартрэтамі А.Я. Макаёнка. Выразкі з газет "Звязда", "Знамя юности", "Литературная газета", "Советская Белоруссия", "Чырвоная змена", "Мінская праўда", "Вячэрні Мінск", часопісаў "Беларусь", "Маладосць", "Неман" | 1980 | 19 | 14 | |
| 5 | Пра смерць і пахаванне А.Я. Макаёнка: "Андрэй Ягоравіч Макаёнак. 1920-1982", "Памяти Андрея Егоровича Макаенка", "Похороны А.Е. Макаенка" і інш. Некралогі, журналісцкая справаздача. На Лл. 1, 4 - фотапартрэты А.Я. Макаёнка. Выразкі з газет "Советская Белоруссия", "Литературная газета", часопісаў "Вожык" і "Неман" | 1982-1983 | 4 | 4 | |
| 6 | Да 70-годдзя з дня нараджэння А.Я. Макаёнка: М. Багадзяж "Яго гумар - з намі"; И. Гуринович "Мастер"; У. Казбярук "На паўночным завулку" і інш. Артыкулы, заметкі, нарыс. З фотапартрэтамі А.Я. Макаёнка. | 1990 | 10 | 8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Выразкі з газет "Звязда", "Знамя юности", "Літаратура і мастацтва", "Советская Белоруссия", "Чырвоная змена", "Гродненская правда", "Да новых перамог" (г. Клецк), часопіса "Беларусь" | | | | |
| 7 | Успаміны пра А.Я. Макаёнка:<br>А. Капусцін "Адзін вечар з Макаёнкам"; Г. Колас "Аўтографы дзевяты і дзесяты"; У. Кухта "Водгук дружбы" і інш. З фотапартрэтамі А.Я. Макаёнка і яго фота ў групах.<br>Выразкі і ксеракопія з газеты "Літаратура і мастацтва", выразкі з часопісаў "Беларусь", "Неман", "Полымя" | 1986-1990 | 28 | 6 | |
| 8 | Т. Абакумовская "О чем расскажет пьеса"; Г. Вавула "Першы "Трыбунал"; И. Вишневская "Штрихи к портрету Андрея Макаёнка. "Я опять написал комедию"; П. Шаўцоў "Збор твораў Андрэя Макаёнка". Артыкулы, заметкі. На Л. 1 - фотапартрэт А.Я. Макаёнка.<br>Выразкі з газет "Літаратура і мастацтва", "Литературная газета", "Советская культура", "Трыбуна працы" (г. Бабруйск) | 1981-1990 | 4 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 9 | "Программа пребывания в Армении делегации Белорусской ССР в связи с днями Белорусской ССР в Армении". Друкаванае выданне.<br>Запрашэнне на вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння А.Я. Макаёнка. Друкаванае выданне з фотапартрэтам А.Я. Макаёнка | 1967, 1990 | 5 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 10 | Пісьмо Д.М. Кавалёва да А.Я. Макаёнка | [1966] | 2 | 1 | |
| | **3 ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 11 | Насценны фотапартрэт А.Я. Макаёнка | [1960-1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 12 | Фатаграфіі А.Я. Макаёнка індывідуальныя.<br>Лл. 1-3 - фота зроблены У.А. Круком для газеты "Літаратура і мастацтва" | [1970-я гг. - 1982] | 6 | 6 | |
| 13 | А.Я. Макаёнак чытае п'есу. Серыя фотаздымкаў для публікацыі ў газеце "Літаратура і мастацтва" | [1971-1982] | 9 | 9 | |
| 14 | Фатаграфіі А.Я. Макаёнка з дзеячамі літаратуры, тэатра і інш.<br>Лл. 1-4, 6-13, 15 - фотаматэрыялы паступілі з рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва", аўтары | [1960-я гг. - 1982] | 19 | 19 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | фотаздымкаў - У.А. Крук (Лл. 1-4, 6-12) і А.Д. Каляда (Л. 15). Л. 5 - фота паступіла з рэдакцыі часопіса "Маладосць" | | | | |

У дадзены вопіс унесена 14 (чатырнаццаць)
спраў з № 1 па № 14 , 78 дакументаў.

Вопіс склаў і апрацоўку
фонда зрабіў

вяд. архівіст ______________________ А.У. Адліванчык

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.